МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

№3 (293) 16 — 22 студзеня 2003г. Наклад 11.800 экз. Кошт 350 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ
Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

АНОНС

СЛОНІМ
У Слоніме трэцяя частка жыхароў — палякі
2 стар.

СЛОНІМ
Міліцыя затрымала аўтамабільных злодзеяў
3 стар.

СЛОНІМ
Слонімскі спявак пакарыў Маскву
4 стар.

НАШ КРАЙ
Мужа убила совком
6 стар.

ВЁСКА
Беларускія калгасы жывуць за кошт дзяржавы
13 стар.

ЗА ЧАШЕЧКОЙ
Для Галины Ложечниковой главное сокровище — дети
14 стр.

КЛАКСОН
Состояние опьянения будут определять по-новому
16 стр.

ОЧЕРЕДНЫЕ 109 СТАЛИ В СТРОЙ

Фота Віталя ГІЛЯ

Фота Віталя ГІЛЯ

Отправка молодого пополнения в Вооруженные силы и другие воинские формирования Беларуси началась 8 января. По сообщению БелаПАН, по опыту последних лет первые новобранцы отправлены в элитные части внутренних и пограничных войск, а также в специальные армейские подразделения.

(Продолжение на 2 стр.)

ПРИЗЫВ

ОЧЕРЕДНЫЕ 109 СТАЛИ В СТРОЙ

(Продолжение. Начало на 1 стр.)

Всего на комплектование войск будет направлено около 14 тысяч человек, из них в Вооруженные силы — немногим больше 10 тысяч. В ходе летней призывной кампании 2002 года эти цифры выглядели соответственно 12.380 и 8.011 человек. Некоторое увеличение общего количества молодого пополнения в Министерстве обороны объясняют регулярной тенденцией, когда осенью контингент, не имеющих права на отсрочку, увеличивается за счет тех, кто завершил учебу в учебных заведениях и тех, кто не поступил в вузы. Что касается увеличения призыва непосредственно в Вооруженные силы, то это объясняют, в частности, передачей департамента железнодорожных войск в подчинение Минобороны. Ранее они считались отдельным воинским формированием.



Фота Віталя ГІЛЯ

До встречи, ребята!

Слонимский районный военкомат этой зимой отправляет в армию 109 парней. Как сообщил корреспонденту "ГС" слонимский военком полковник Анатолий Михальчик, 72 из них направлены для прохождения службы в 11 отдельную механизированную бригаду. Эти ребята будут служить вблизи от дома. Но география призывников — а их пришло в бригаду уже около 400 — охватывает практически все регионы Беларуси: Гомель, Минск, Бобруйск, Могилев, Полоцк, Кореличи, Зельва, Мосты, Волковыск, Пинск, Брест... Последний призывник придет в войска 15 января. А уже 2 февраля молодые воины примут присягу.

Между тем, полным ходом идет увольнение солдат, выслуживших установленные сроки службы. К примеру, в 11 механизированной бригаде по состоянию на 13 января "дембелей" оставалось всего 55. По словам командира бригады полковника Николая Скобелева, все они будут уволены до 20 января.

Валерий КОВАЛЕНКО

ІНТЭРВ'Ю

Леанарда РЭЎКОЎСКАЯ: "БОЛЬШ ЗА СТО ЧАЛАВЕК У СЛОНІМЕ ВЫВУЧАЕ ПОЛЬСКУЮ МОВУ"

Кіраўнік Слонімскага раённага аддзела грамадскага аб'яднання "Саюз палякаў на Беларусі" Леанарда Рэўкоўская лічыць, што ў 53-тысячным Слоніме кожны трэці яго жыхар па нацыянальнасці паляк. Сёння Леанарда Іосіфаўна адказвае на пытанні карэспандэнта "ГС".

— Леанарда Іосіфаўна, скажыце, калі ласка, з чаго пачынаўся Слонімскі раённы аддзел грамадскага аб'яднання "Саюз палякаў на Беларусі"?

— Яшчэ да таго, як мы зарэгістравалі наша грамадскае аб'яднанне, мясцовыя слонімскія палякі стараліся адбудаваць у Слоніме касцёлы. Гадоў пятнаццаць назад, памятаю, калі ў школе не было заняткаў, я ішла добраўпарадкоўваць касцёл Святога Андрэя. Са мною тады працавала шмат людзей. Аднойчы я налічыла аж 86 чалавек у адзін дзень. Найстарэйшай, Канстанцыі Гаркавай, было больш за 80 гадоў, а наймешай дзяўчынцы споўнілася толькі восем. Усе мы разам выносілі смецце, каменне, адным словам, ачышчалі касцельную тэрыторыю ад бруду. Калі касцёл Святога Андрэя быў адбудаваны, мы стварылі і зарэгістравалі Слонімскі аддзел "Саюза палякаў на Беларусі".

— І колькі цяпер у Слоніме налічваецца палякаў?

— Такая лічба, хоць і недакладная, ёсць. Кожны трэці мясцовы жыхар — паляк.

— Не забывайце, Леанарда Іосіфаўна, што каталік — гэта не значыць, што ён паляк.

— Сапраўды, каталіком можа быць і беларус, і рускі, і нават турак. Але размова ідзе менавіта пра палякаў. Бяда ў тым, што ў гісторыі шмат фактаў, як Расійская імперыя знішчала палякаў ды і беларусаў. Амаль усю Варшаву выразаў Сувораў, сотні тысяч беларусаў знішчыў і ўзяў у палон на Палессі. І за гэта ён атрымліваў званні і ордэны...



Леанарда Рэўкоўская

— Тым не менш, сёння руская праваслаўная царква лічыць, што экспансія каталіцызму на Беларусь і Расію ідзе з Захаду.

— Але я хачу хоць зараз, гледзячы ў вочы Алексію і Філарэту, запытаць: з Захаду ці з Усходу экспансія? Найперш, каталіцызм ідзе з Усходу, але яны гэтага, як быццам, не бачаць. У Навасібірскай, Омскай, Іркуцкай і іншых абласцях пабудавалі за апошнія гады дзесяткі касцёлаў. Бо там жывуць тысячы палякаў, дзеці і ўнукі рэпрэсіраваных і сасланых у тыя далёкія рэгіёны Расіі. Там нашы браты і сёстры, яны хочуць маліцца ў касцёлах, дык навошта ім забараняць. Тым не менш, я ніколі не чула, каб хоць адзін з былых рэпрэсіраваных хацеў нейкай помсты...

— З Сібіры давайце ўсё ж вернемся ў Слонім. Якія галоўныя задачы і мэта вашага грамадскага аб'яднання?

— Найгалоўнейшай задачай з'яўляецца навучанне дзяцей польскай мове. У свой час, калі я працавала настаўніцай біялогіі ў СШ № 1, мне ўдалося сабраць некалькі дзесяткаў заяў і арганізаваць польскамоўны гурток, які пачаў дзейнічаць з 1 сакавіка 1992 года. Колькасць бацькоўскіх заяў наконт вывучэння польскай мовы ў слонімскіх школах павялічвалася. І яе пачалі вывучаць, а ў 1995 годзе колькасць дзяцей у Слоніме, якія вывучалі польскую мову, дасягнула лічбы 545. На вялікі жаль, з цягам часу некаторым нашым мясцовым чыноўнікам гэта не спадабалася. І яны сталі рабіць усё, каб спыніць рост польскамоўных класаў. Таму цяпер крыху больш за сто чалавек вывучае ў Слоніме польскую мову. Гэта ў СШ №№ 3, 10, 2,1 і ў гімназіі, а таксама ў грамадскай школе, якая дзейнічае пры нашым таварыстве.

Другою задачаю нашага таварыства з'яўляецца адраджэнне польскай культуры. Мы штогод адзначаем рэлігійныя святы. Дзеля гэтага стварылі хор "Крэда" і хор трох пакаленняў. Выступаем на розных фестывалях, конкурсах, сустрэчах. Неаднаразова станавіліся пераможцамі. Маем свой танцавальны калектыў "Бліскавічка". Ёсць у нас і свая бібліятэка, якая месціцца ў Слонімскім доме афіцэраў. І што цікава, колькасць польскамоўных чытачоў з кожным годам павялічваецца.

— А дзе вы для сваёй бібліятэкі бралі кнігі?

— Па хатах збіралі. Прыносілі літаратуру, якая захоўвалася ў Слоніме яшчэ з 20-30-х гадоў мінулага стагоддзя. Дапамагаюць кнігамі і палякі з суседняе дзяржавы. Цяпер у нашай бібліятэцы налічваецца больш за дзве тысячы польскамоўных кніг.

— Ці падтрымліваеце вы сувязі з тымі слонімскімі палякамі, якія пражываюць у іншых краінах?

— Абавязкова. Запрашаем да нас у Слонім. Асабліва, калі тут праводзім музычныя святы і фестывалі. Мы ж у Слоніме арганізавалі два фестывалі польскай песні, фестываль эстраднай польскай песні і фестываль, прысвечаны Станіславу Манюшку.

— Сябры вашага аб'яднання займаюцца таксама добраўпарадкаваннем старых слонімскіх могілкаў?

— Сапраўды, так. Пачалі мы з могілак на Віленскай вуліцы. Цэлы месяц іх добраўпарадкоўвалі. Пасля ачысцілі могілкі на Школьнай вуліцы і Ружанскай.

— Якія планы ў вас на гэты год?

— Для Слонімскага аддзела "Саюза палякаў на Беларусі" патрэбна памяшканне, бо месцімся мы ў маёй уласнай кватэры. Памяшканне патрэбна такое, каб можна было праводзіць рэпетыцыі хору, танцавальнага калектыву і г.д. Вось такая наша мара.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

КАДРАВАЯ РЭАРГАНІЗАЦЫЯ Ў ТЭАТРЫ

Былы галоўны рэжысёр Слонімскага беларускага драматычнага тэатра Віктар Бутакоў і яго жонка артыстка Тамара Галаванава па ўласнаму жаданню звольніліся з тэатра.

Рэжысёрам тэатра прызначылі Васіля Сяўца, які ў бліжэйшы час прыступіць да пастаноўкі новага спектакля для дзяцей. У другой палове студзеня на працу прыязджае яшчэ адзін рэжысёр з Гродна Віктар Небальсін. Дарэчы, ён раней працаваў у тэатры і паставіў спектаклі "Пакрыўджаныя", "Камедыя" і іншыя.

ЗЛАЧЫННАСЦЬ ПАРАНЕЙШАМУ РАСЦЕ

Калі параўноўваць колькасць злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку па выніках 2001 і 2002 гадоў на Слонімшчыне і ў суседніх з ёй раёнах, то наглядаецца тэндэнцыя, што яна штогод павялічваецца.

У мінулым годзе, у параўнанні з 2001-м, у Слонімскім раёне злачыннасць павялічылася на 10,2 %, у Зэльвенскім — на 15,6 %, у Дзятлаўскім — на 23,1 %, у Ваўкавыскім — на 46,5 %, у Мастоўскім — на 21,5 %.

А ў цэлым, па Гродзенскай вобласці злачыннасць павялічылася на 28,2 %.

Сяргей ЧЫГРЫН

СТВОРАНА КРАЯЗНАЎЧАЕ ТАВАРЫСТВА

У Слоніме пачало дзейнічаць раённае краязнаўчае таварыства імя Гальяша Леўчыка.

Кіраўніком краязнаўчага таварыства абраны Сяргей Чыгрын, намеснікам — Святлана Пракоф'ева. У склад рады таварыства ўвайшлі таксама Васіль Супрун, Павел Лойка і Аляксей Якімовіч.

Мэта дзейнасці таварыства — пошук і захаванне гістарычнай спадчыны Слонімшчыны.

Мікола КАНАНОВІЧ

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ

в г. Слониме по состоянию на 10^{00} 14.01.2003г.

	Покупка	Продажа
"Беларусбанк"		
1 USD	1940	1970
1 EURO	1970	2060
1 ZL	505	535
1 RUR	56	61
оао "Белпромстройбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1935	1958
1 EURO	2000	2055
1 ZL	490	520
1 RUR	59	61
"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1930	1960
1 EURO	1990	2050
1 ZL	475	510
1 UAH	330	360
1 RUR	58	61,5
Нацбанк РБ		
1 USD	1931	
1 EURO	2037,59	
1 RUR	60,67	

ІНТЭРВ'Ю

Аляксандр ТАЛЕРЧЫК: "Я НАПІСАЎ ПРАЎДЗІВУЮ ГІСТОРЫЮ СВАЁЙ ВЁСКІ"



Аляксандр Талерчык

У мінулую пятніцу ў памяшканні Слонімскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Якуба Коласа адбылася прэзентацыя кнігі нашага земляка Аляксандра Талерчыка "Парэчча".

Кніга прысвечана 450-гадовай гісторыі вёскі Парэчча, што на Слонімшчыне. Падчас прэзентацыі аўтар кнігі Аляксандр Талерчык адказаў на пытанні карэспандэнта "ГС".

— Аляксандр Сямёнавіч, чаму вы, ні філолаг, ні гісторык па адукацыі, вырашылі напісаць гісторыю сваёй роднай вёскі?

— Мяне пабудзіла гэта зрабіць адно здарэнне, якое адбылося ў Парэччы. Калісьці тут былі пабудаваны школа і царква. Арганізатарам гэтых будоўляў быў святар Аляксандр Гарачка. Школу і царкву ён пабудаваў за два гады. Царква была ці не адным з першых сельскіх праваслаўных храмаў у Слонімскім раёне. Гэта было ў 1857 годзе. Святар парэцкі даўно ўжо памёр. А ўдзячныя вучні і прыхажане яго пахавалі каля царквы. Зрабілі чыгунныя агароджу, надмагільны помнік і пліту.Тут расло шмат бэзу, а на святы нам бацькі расказвалі пра гэтага шчодрага і шчырага чалавека.

Прайшло сто гадоў. І аднойчы нашай Парэцкай школе давodзяцца план па збору металалому. Адна настаўніца са сваімі вучнямі пайшлі да царквы, разабралі помнік на металалом, пагрузілі яго на машыну і здалі дзяржаве. За тое, што гэты клас сабраў больш за ўсё металалому, іх ўзнагародзілі граматаю. Падобны ўчынак мяне вельмі ўразіў. Але ці ведалі яны, чыю магілку разбурылі? Я размаўляў тады з настаўнікамі Парэцкай школы і, нават, папракаў іх за тое, што імі была знішчана магіла першага настаўніка нашай школы. Яны сказалі, што пра гэты факт не ведалі. Такі выпадак узварушыў маю душу, ён пабудзіў мяне расказаць аднавяскоўцам праўду пра гісторыю Парэчча і яе людзей.

— Ці ўсё, што вам удалося знайсці, увайшло ў кнігу?

— Сродкі на выданне кнігі і аб'ём яе былі абмежаваныя. Таму шмат артыкулаў не трапілі ў кнігу. Ёсць многа архіўных матэрыялаў, якія звязаны з Міхалам Валовічам — кіраўніком паўстання 1830-1831 гадоў. У кнізе ён больш паказаны, як паўстанец, як змагар за незалежнасць Бацькаўшчыны. Але Міхал Валовіч і яго бацька змагаліся за адмену прыгоннага права на нашай зямлі. Валовічы былі багатымі людзьмі на Слонімшчыне, мелі шмат зямлі, на іх працавалі сяляне, але яны, як не дзіўна, патрабавалі адмены прыгоннага права. Валовічы хацелі, каб сяляне былі вольнымі людзьмі, каб працавалі на сваёй зямлі. Я ў архівах на гэты конт знайшоў шмат матэрыялаў, якія трэба публікаваць. Міхал Валовіч быў чалавекам-гуманістам, даволі адукаваным, і ён добра разумеў, што сяляне такія ж роўныя перад Богам людзі, як і ўсе.

— Якія ў вас творчыя планы на гэты і наступныя гады?

— Калі дазволіць здароўе, хачу расказаць чытачам пра жыццё беларускіх людзей перыяду падзелу Рэчы Паспалітай. Паказаць, як жыла Расія да таго, як яна далучыла да сябе Беларусь. Як жылі Польшча і Літва да гэтага. І як зажылі беларусы ў складзе Расійскай імперыі. Над гэтым я зараз і працую.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗДАРЭННІ

ЛЮДЗІ ЗАМЕРЗЛІ НА МАРОЗЕ

10 студзеня на вуліцы Агінскага ў Слоніме быў выяўлены труп мужчыны. Ім аказаўся 34-гадовы мясцовы жыхар П. Мужчына замерз на марозе.

А ў вёсцы Ламашы мясцовы пенсіянер, які вяртаўся на сваім кані дамоў з гасцей, заснуў у возе. Мужчына так і праспаў на марозе да святла. Раніцай з абмаражэннем ён быў дастаўлены ў бальніцу, дзе і памёр.

ЗГАРЭЛА Ў СВАЁЙ ХАЦЕ

У ноч з 11 на 12 студзеня ў вёсцы Бабынічы ў сваёй хаце згарэла жанчына 1926 года нараджэння.

Як паведамілі ў Слонімскай міжрайпракуратуры, прычынай пажару стала залішне напаленая печка.

АЎТАМАБІЛЬНЫХ ЗЛОДЗЕЯЎ ЗАТРЫМАЛІ

Шостага студзеня работнікі міліцыі затрымалі групу непаўналетніх, якія працяглы час здымалі магнітолы, акумулятары і іншыя дэталі і рэчы з аўтамабіляў на розных вуліцах горада.

Аўтамабільнымі злодзеямі аказаліся чацвёра падлеткаў ва ўзросце ад 15 да 17 гадоў, якія жывуць у вёсцы Пятралевічы. Па фактах шэрагу крадзяжоў у дачыненні іх узбуджана крымінальная справа. Па словах работнікаў крымінальнага вышуку, у дадзеным выпадку іх уразіла, што вясковыя хлопцы неаднойчы займаліся сваім "промыслам" у горадзе ноччу, і тая акалічнасць, што дзеці адсутнічаюць дома, ніяк не насцярожыла іх бацькоў. Цяпер падлеткам прыйдзецца несці адказнасць па закону.

Па звестках з міліцыі, пятралевіцкія хлопцы, гэта не адзіная група, што займалася крадзяжамі з аўтамабіляў слонімцаў — ёсць і іншыя. Таму аўтаўладальнікам варта падумаць перад тым, як пакідаць сваю машыну на вуліцы без нагляду.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАВІНЫ

УЗНАГАРОДЖАНЫ ГРАМАТАМІ

За плённую і добрасумленную працу Гродзенскі аблвыканкам узнагародзіў Ганаровай граматай Алега Лаўрэнку — начальніка Слонімскага аддзялення ўпраўлення КДБ.

Ганаровую грамату атрымала таксама і Марыя Данюк — рэдактар газеты "Слонімскі веснік".

Міхась АКУЛКА

ПЕРШЫ СЛОНІМЕЦ 2003 ГОДА

Першага студзеня ў 10 гадзін 25 хвілін у Слонімскім раддоме нарадзілася першае слонімскае немаўля 2003 года.

Ім стаў сын Таццяны Юркоўскай. Хлопчык нарадзіўся вагою 3 кг 730 г.

Сяргей ЧЫГРЫН

СТАТЫСТЫКА

У СУДДЗЯЎ СПРАЎ ХАПАЛА

Напружаным быў мінулы год для работнікаў Слонімскага раённага суда.

У 2002 годзе было вынесена 370 прыгавораў па крымінальных справах (436 у 2001г.), разгледжана 1175 грамадзянскіх спраў (1101 у 2001г.) і па 976 з іх былі вынесены рашэнні (880 у 2001г.). У адміністрацыйным парадку суддзі разгледзелі 2310 спраў (2126 у 2001 г.).

Такім чынам, па ўсіх паказчыках у 2002 годзе ў суддзяў было больш працы, чым у 2001.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПОСЛЕ ПРОИСШЕСТВИЯ

ПОКУРИЛИ — И НЕТ СПОРТЗАЛА

Как уже писала "ГС", 27 декабря в Новодевятковичской средней школе сгорел спортзал, расположенный на втором этаже здания.

По предварительным данным отмечалось, что причиной пожара стало как-будто замыкание электропроводки. Однако, как позже выяснили специалисты Слонимской пожарной инспекции, пожар в спортзале произошел из-за неосторожного обращения с огнем во время курения. Дело в том, что несколько молодых людей во время праздничного мероприятия, проходившего в тот день в здании школы, решили незаметно от взрослых покурить на втором этаже. Покурили так, что чуть школу родную не сожгли. По словам директора школы Павла Крота, после каникул учебный процесс не будет приостановлен.

"Мы уже почти закончили ремонт: покрасили потолок, окна. А крышу над спортзалом восстановим немного позже. Поэтому причин для волнения уже нет", — сказал Павел Владимирович.

А пока следственным органам предстоит выяснить, кто же будет возмещать причиненный школе ущерб в сумме 1 миллион 888 тысяч рублей.

Ольга ШИНКЕВИЧ

НОВОСТЬ

ПАСПОРТИЗАЦИЯ НАСЕЛЕНИЯ ЗАВЕРШИТСЯ ДО 1 ИЮЛЯ 2004

При условии нормального финансирования паспортизация населения Беларуси завершится к 1 июля 2004 года. Об этом на встрече с журналистами в Минске заявили руководители управления паспортно-визовой службы (УПВС) Министерства внутренних дел.

По данным управления, в прошлом году гражданам Беларуси было выдано примерно 1 млн. 368 тыс. национальных паспортов. С начала паспортизации документы получили более 7,8 млн. граждан, что составляет 78 процентов населения страны.

В настоящее время запасов бланков национальных паспортов в УПВС практически нет, а те, что печатаются, сразу идут в работу, сообщила заместитель начальника УПВС подполковник Лидия Иванчикова.

Пожилым же гражданам Беларуси милиция напоминает, что, в соответствии с постановлением Совета министров от 29 октября 2002 года, после 1 июля 2004 года паспорта СССР образца 1974 года и Республики Беларусь образца 1993 года (с гербом «Погоня») будут недействительны, и их обладатели могут столкнуться с проблемами в повседневной жизни.

Как отметил начальник УПВС МВД полковник Михаил Петюль, белорусским законодательством не предусмотрена уголовная ответственность в случае отсутствия у человека паспорта. Однако гражданин, не имеющий этого документа, может быть наказан в административном порядке.

БелаПАН

НАВІНА

НОВЫ ДЫРЭКТАР

Новым дырэктарам Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя Язэпа Стаброўскага прызначана Алена Сяргейчык, якая да гэтага працавала спецыялістам аддзела культуры Слонімскага райвыканкама.

Былы дырэктар музея Ірына Шпыркова працуе цяпер галоўным захавальнікам фондаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗДАРЭННІ

"ПАГАРЭЎ" З КУРАМІ

Раней судзімы 25-гадовы слонімец К. у ноч з 8 на 9 студзеня ўкраў у адным з хлявоў на Косаўскім тракце восем курэй.

Аднак скарыстаць чужую птушку ён не паспеў, бо па гарачых слядах быў затрыманы работнікамі міліцыі.

У ва што яму абыдзецца паход за курамі, вызначыць суд.

НІЧОГА НЕ ЎЗЯЛІ

У ноч з 11 на 12 студзеня невядомыя асобы сарвалі замкі і праніклі ў памяшканне кафэ "Бярозка" на плошчы Л.Сапегі.

Міліцыя праводзіць праверку з мэтай высветліць, што ж шукалі няпрошаныя госці, паколькі з "Бярозкі" нічога не прапала.

АХВЯРА ВЫТВОРЧАСЦІ

На мінулым тыдні на рабочым месцы пацярпела работніца каўбаснага цэха Слонімскага мясакамбіната.

Падчас працы руку жанчыны зацягнула ў драбільную машыну. З траўмай жанчына была дастаўлена ў мясцовую бальніцу.

Мікола КАНАНОВІЧ

ДОБРО ПОЖАЛОВАТЬ

СЕРВИС ВЫШИБАЕТ СЛЕЗЫ



Фота Віталя ГІЛЯ

Микрорайон "Энка" 14.01.2003 г.

Закончились и Новогодние, и Рождественские праздники. Уж столько мы друг другу всего самого наилучшего нажелали, сколько надежд на наступивший год возложили. Но оказывается, запланированное слишком хрупко и ненадежно, и разрушить планы можно с необычайной легкостью.

Хотя бы возьмем такую будничную тему: как после праздников добраться в Минск или Гродно. Казалось бы, после возникновения в Слониме нескольких фирм, занимающихся пассажирскими междугородними перевозками, проблема эта несколько утратила свою остроту. Но нет.

На прошлую среду, 8 января, заказать места на микроавтобусы накануне поездки было невозможно. И все же, даже забронированное место, как оказалось, не всегда гарантирует, что вы попадете в нужное время в нужное место. И плохо, что порой в заблуждение нас вводит газетная реклама, хотя сама газета не виновата в недобросовестности рекламодателей и ответственности за их действия не несет.

Итак, среда, раннее утро, мороз под тридцать градусов. На остановке микрорайона "Энка" собрались люди в ожидании "бусиков", чтобы уехать на Минск и Гродно. Но не все дождались. Несколько микроавтобусов различных фирм действительно приехали и забрали своих пассажиров. А вот две машины одной из фирм завестись не смогли. Как сказал её руководитель, по причине сильного мороза. Впрочем, к семи часам утра двигатели все же заработали, и водители выехали на маршрут, чтобы предупредить клиентов, что поездка отменяется. А тем временем жена предпринимателя, по его словам, отвечала на звонки и объясняла сложившуюся ситуацию людям.

Тем не менее, как оказалось на самом деле, на "Энку" водители "бусов" съездить не удосужились, и там клиенты оставались в неведении и негодовании от рушащихся планов на поездку.

Так, жительница Слонима Куделько Л. В., не дождавшись автобуса, с половины восьмого пыталась дозвониться по телефону фирмы, — безуспешно. Лишь в начале десятого, по словам женщины, предприниматель появился на связи. А на все вопросы, по словам несостоявшейся пассажирки, он отвечал, что сегодня автобусы не пойдут, а телефоны были отключены, потому что он не собирался беспокоить свою жену звонками с претензиями, на которые она ответить не в состоянии.

— Мне не надо от него никаких денег, — выплеснула свою горечь со слезами на глазах расстроенная женщина. — Но пусть бы этот предприниматель хотя бы просто по-человечески извинился. А слышать грубость... Для меня эта поездка была очень важна, и я вправе была на лучшее к себе отношение...

Где искать в данном случае справедливость, каждый решает для себя сам. Кто-то идет со своей обидой в газету, кто-то решит обратиться в суд. Но, думаю, обманутые в своих ожиданиях люди частному извозу и конкретно этой фирме доверять перестанут. А жаль.

Валерий КОВАЛЕНКО

НАВІНА

ЗВЯРОВІЧ ПАКАРЫЎ МАСКВУ

Наш зямляк, спявак Аляксандр Звяровіч, заняў трэцяе месца ў фінале Усерасійскага адкрытага конкурсу маладых выканаўцаў рускага рамансу "Рамансіяда".

Гэты конкурс адбыўся напярэдадні Новага года ў Калоннай зале Дома Саюзаў у Маскве. Аляксандр выканаў два рамансы — рускі "Асенняя раса" і цыганскі "Мярцвяк". Яго выступленне проста пакарыла журы. А кіраўнік цыганскага ансамбля "Рамэн" Мікалай Слічэнка павіншаваў Аляксандра Звяровіча з поспехам асабіста і разам з ім дуэтам выканаў адзін з рамансаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПРЕМИЯ

ПРЕЗИДЕНТСКИЕ НАГРАДЫ

Александр Лукашенко подписал распоряжение о присуждении специальных премий президента Республики Беларусь деятелям культуры и искусства. Об этом сообщает пресс-служба президента.

Глава государства согласился с решением совета Фонда президента по поддержке культуры и искусства и постановил наградить за высокие творческие достижения в 2002 году специальными премиями (по 100 базовых величин каждая, т.е. около 550 долларов США) деятелей культуры и искусства.

В номинации "музейное дело" награждён коллектив Слонимского районного краеведческого музея им. И.И.Стабровского — за большую работу по пропаганде историко-культурного наследия, активную просветительскую и научную деятельность, организацию ряда стационарных и передвижных выставок.

Премии будут выплачены из средств Фонда президента Республики Беларусь по поддержке культуры и искусства. Лауреаты освобождены от уплаты подоходного налога по суммам полученных премий.

Андрей ОСМОЛОВСКИЙ, БелаПАН

ВЫБАРЫ

ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ЗАКАНЧВАЕЦЦА

20 студзеня — апошні дзень вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Слонімскага раённага Савета дэпутатаў 24 склікання. Нагадаем, што выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусь прызначаны на 2 сакавіка 2003 года.

Вылучэнне кандыдатаў пачалося 22 снежня 2002 года — за 70 дзён да выбараў — і па закону павінна закончыцца 20 студзеня, за 40 дзён да выбараў. У Слонімскай раённай выбарчай камісіі спачатку была зарэгістравана 21 ініцыятыўная група па збору подпісаў у падтрымку свайго кандыдата ў дэпутаты райсавета. Аднак, як паведамілі карэспандэнту "ГС" у раённай выбарчай камісіі, у ходзе збору подпісаў адзін з кандыдатаў зняў сваю кандыдатуру. Такім чынам, вылучацца ў кандыдаты шляхам збору подпісаў засталіся 20 чалавек. Па стану на 10 студзеня, працоўныя калектывы Слонімшчыны вылучылі восем кандыдатаў у дэпутаты. Але гэтая лічба не канчатковая — вылучэнне кандыдатаў ад працоўных калектываў працягваецца.

Участковыя выбарчыя камісіі канчаткова павінны быць сфарміраваны да 15 студзеня, за 45 дзён да выбараў.

Мікола КАНАНОВІЧ

ФЕЛЬЕТОН

СТРАЛЯЮЦЬ

По вечарах у горадзе страляюць. Ужо не так часта, як напярэдадні Новага года і ў калядныя святы, але, мусіць, "боепрыпасы" яшчэ не скончыліся.

Ідучы вечарам каля крамы "Спадарожнік", абмінуў групу дзяцей гадоў 10 – 12-ці. Але не паспеў адысціся ад іх і на некалькі крокаў, як ззаду так бабахнула, што я падскочыў, як заяц. А калі ачомаўся, злосць узяла — так напалохалі падшыванцы! А самі як стаялі, так і стаяць. Быццам яны тут зусім ні пры чым.

— Мужыкі, — пытаю, — што за вайна, і дзе вы сваю ўзрыўчатку бераце? Здаецца ж, прадаваць забаранілі?

— Ага, — адказваюць, — забаранілі. То вы ў нас купіце. Танна. Петарда — стольнік.

— Ну, а ўсё-такі, — працягваю дапытвацца, — вы то дзе гэтае дабро купілі?

Хлопцы спачатку быццам нешта западозрылі ў маіх пытаннях, пашушукаліся між сабой, але хутка выдалі:

— Месцы патрэбна ведаць і прадаўцоў. Былі б грошы, а такіх штучак у горадзе хапае. І на рынку прадаюць, і на Брэсцкай, і на Энцы... І мы вам можам прадаць, — дапоўніў таварыша той, што пайшоў са мной на размову першым...

Купіў я такі ў іх адну петарду за сто рублёў. Дома паклаў у шуфляду пісьмовага стала і забыўся. На час.

Назаўтра пасля сустрэчы з "партызанамі" дзень у мяне выдаўся цяжкім. Стаміўся так, што спаць лёг у дзевяць гадзін вечара. Здаецца, толькі заснуў, як у двары дома — ба-ба-х раз, ба-ба-х два! І зноў жа, знянацку так, пад прыемны сон, які прайшоў у імгненне вока. Я лямпу запаліў, на гадзіннік гляну — пачатак адзінаццатай. А тут ізноў — ба-ба-х! І чую, у суседкі зверху дзіця заплакала — пераклрыцці паміж паверхамі ў "трушчобах" усе гукі прапускаюць, — а за плачам малюкі пачуліся. Не дзіцячыя, канечне. У чый адрас толькі не разабраў. Ці то стралкоў жанчына лаяла, ці то на дзіця сваё, якое пры стрэлах спаць не прывучана?

А тыя ў двары, знай сабе, страляюць. То залпамі, то адзіночнымі стрэламі з інтэрвалам не болей пяці мінут. Не ведаю, што зрабіла суседка зверху, але дзіцячы плач праз хвілін дзесяць сціх, хоць стрэлы працягваліся. Я слухаў і з надзеяй чакаў, што, ці мароз стралкоў дапячэ, ці боезапас у іх скончыцца. І калі падпальваў пасля першага стрэлу ўжо трэцюю цыгарэту, гляну на гадзіннік і ўбачыў, што стрэлкі паказваюць на пачатак дванаццатай ночы. Гэта ж больш як гадзіну стралялі, лічы, у цэнтры горада, і хоць бы ім хто заўвагу зрабіў! Сам я, праўда, дарэмна пад "кулі" галаву падстаўляць таксама не ахвочы...

І толькі я так падумаў, як з вуліцы пачуліся дзявочыя галасы, смех, а потым і піск. Пакуль я, парушаючы ўсе правілы пажарнай бяспекі, дапаліў у ложку апошнюю цыгарэту, стрэлаў з двара больш не чулася. Толькі галасы і смех. Зусім не дзіцячыя, ці не зусім дзіцячыя — з трэцяга паверха пры зачыненых вокнах так адразу не разбярэш.

А пакольскі спаць ужо не хацелася, ды і пакой пасля курыва праветрыць не лішне, то я падняўся з ложка, не запальваючы святла, адчыніў фортку і глянуў уніз. Нічога незвычайнага там не ўбачыў. Кампанія падлеткаў-старшакласнікаў сабралася на тусоўку. Відаць, стрэламі сённяшнія кавалеры сваіх паненак з кватэраў выклікалі.

Так разважаючы і гледзячы на іх , я раптам успомніў пра сваю, купленую за сто рублёў, петарду. І, як пісаў паэт, маланкай думка слізганула! Толькі ў мяне яна не знікла. Я хуценька знайшоў у шуфлядзе петарду, шчоўкнуў запальнічкай і праз фортку зверху кінуў уніз. Кампанія маладых людзей стаяла акурат насупраць майго акна...

Ну і бабахнула! Тыя ўнізе, ад нечаканасці, з крыкамі і віскам кінуліся наўцекі. У доме насупраць імгненна засвяцілася палова вокнаў, а дзіця маёй суседкі зверху так закрычала, што яго маці страціла палову слоўнікавага запасу мацюкоў, каб яго супакоіць.

І тут я зразумеў, чаму ў нашым горадзе страляюць. Гэта ж такі кайф бабахнуць, калі нельга, ці нехта там забараняе.

Юрка КАРПАЧ

ДЗЯТЛАВА

ПАЖАР ЗДАРЫЎСЯ ЎНАЧЫ

Студзеньскай ноччу ў вёсцы Капці Дзятлаўскага раёна адбыўся пажар.

Загарэлася хата пенсіянера Н. Агнём знішчаны пабудова і ўся маёмасць. Удалося вынесці толькі тэлевізар.

Як высвятляецца, прычынай пажару стала сапсаваная электраправодка.

ХАМУТ, ДУГА І ВІЛЫ

Адзін са злодзеяў, відаць, вырашыў змяніць кваліфікацыю і ўсур'ёз заняцца сельскай гаспадаркай.

Ён залез у павець да жыхара пасёлка Казлоўшчына Дзятлаўскага раёна і ўкраў хамут, дугу і вілы. Гэтае сялянскае дабро ён павёз на веласіпедзе, які там жа ўкраў.

Асобу злодзея ўстанаўлівае міліцыя.

НЕБЯСПЕЧНЫ ГАЛАЛЁД

У Дзятлаве на скрыжаванні вуліц Кірава і Кастрычніцкай сутыкнуліся тры легкавыя машыны.

На шчасце, людзі, якія знаходзіліся ў салонах аўтамабіляў, не пацярпелі. Дарэчы, на той час вуліцы былі пасыпаны пяском, але пад ім ўсё роўна застаўся лёд.

Жыхарка Дзятлава, грамадзянка В., па гаспадарчых справах выйшла на свой надворак. Нечакана жанчына паслізнулася і ўпала, у выніку чаго моцна стукнулася галавой. Не прыходзячы ў прытомнасць, праз некалькі дзён яна памерла. Была яна ў такім узросце, пра які кажуць: яшчэ жыць ды жыць.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

МАСТЫ

НОВЫЯ ЛЮДЗІ

Пачатак Новага года адзначаны павелічэннем нараджальнасці ў Мастах. За першыя дзевяць дзён нарадзілася адзінаццаць дзяцей.

Першынцам 2003 года стаў хлопчык вагою 3 кг 800 г. Яго нарадзіла Таццяна Пруская.

За гэтыя дні пік нараджальнасці прыйшоўся на праваслаўныя Каляды. У гэты дзень з'явілася трое немаўлят. Як сведчыць статыстыка, толькі ў радзільным аддзяленні Мастоўскага ТМА за мінулы год нарадзілася 337 дзяцей. У агульнай колькасці народжаных 2002 года прыведзеныя лічбы крыху недакладныя, бо мастаўчанкі нараджалі ў Шчучыне, Ваўкавыску, Гродне і іншых гарадах.

ЛАМАЮЦЬ НОГІ

Суровая зіма і адсутнасць у камунальнікаў належнай тэхнікі для ўтрымання дарог у належным стане выклікалі ў Мастах рост выпадкаў траўматызму.

За апошні тыдзень штодзённа на прыём да траўматолага мясцовай паліклінікі звярталіся з пераломамі і іншымі пашкоджаннямі не менш пяці новых пацыентаў. У чатырох з пяці — пераломы ног.

Антон МАКЕЙ

ФОТАФАКТ


Зимний Гродно
Фота IREX/ProMedia

ЗЭЛЬВА

СВЯТА Ў НЯДЗЕЛЬНАЙ ШКОЛЕ

У час, калі ў грамадстве пануюць зло, цынізм, жорсткасць і раўнадушша, людзям не хапае дабрыні, спачування, цёплых чалавечых адносін.

Насілле на тэлеэкранах (нават у дзіцячых мультфільмах!), камп'ютарныя гульні з забойствамі – усё гэта стала звычайнай з'явай. Калі мы, дарослыя, ужо не звяртаем увагі на такія жахлівыя рэаліі, то дзіцячая душа асабліва чуйна рэагуе на адмоўныя бакі нашага жыцця. Выпадкі дзіцячага злачынства сёння палохаюць нават міліцыю. Урачоў-псіхіятраў хвалюе несуцяшальная статыстыка аб ненармальнасцях у дзіцячых паводзінах, расце колькасць псіхічных адхіленняў, павялічваюцца выпадкі самазабойстваў сярод моладзі і падлеткаў. Дык як жа захаваць дзіцячую душу ад расчаравання і зла? Як дапамагчы маленькаму чалавеку стаць высокамаральнай асобай? Адказ на гэтыя пытанні спрабуюць знайсці некаторыя бацькі шляхам далучэння сваіх дзяцей да духоўнасці.

Ужо некалькі год пры Свята-Троіцкім храме, што ў Зэльве, існуе Нядзельная школа. У гэтай школе займаюцца 35 дзетак. Заняткі праходзяць кожную нядзелю ў будынку зэльвенскай школы мастацтваў. Навучальна-выхаваўчы працэс размеркаваны па трох узроставых групах : малодшай, сярэдняй і старэйшай. Выхаванцы Нядзельнай школы вывучаюць Закон Божы, знаёмяцца з азамі праваслаўнай веры, а таксама вучацца любіць сваю Радзіму, паважаць бацькоў, быць высокадухоўнымі людзьмі. У свята Божага Нараджэння, якое праваслаўныя вернікі адзначалі 7 студзеня, вучні Нядзельнай школы разам са сваімі настаўнікамі падрыхтавалі святочную праграму. Яны прапанавалі прысутным невялікую пастаноўку, сцэнарый якой нагадваў біблейскае паданне пра нараджэнне Ісуса Хрыста. Дзеці чыталі вершы, спявалі калядныя песні, адгадвалі загадкі на біблейскія тэмы.

Затым са святам Ражджэства Хрыстова маленькіх артыстаў павіншаваў настаяцель Свята-Троіцкага храма айцец Аляксандр Аўсіевіч. Напрыканцы свята вучні Нядзельнай школы, іх настаўнікі і бацькі сабраліся за "салодкім" сталом.

Наталля ГЛУШЭНЯ

БАРАНОВИЧИ

СТАБИЛЬНО РАБОТАЛИ ВСЕГО ТРИ ПРЕДПРИЯТИЯ

В 2002 году в Барановичах стабильно работали всего три предприятия — станкостроительный и автоагрегатный заводы, а также комбинат пищевых продуктов.

Об этом сообщил заместитель председателя Барановичского горисполкома Анатолий Перепелкин на заседании исполкома, где подводились итоги работы за минувший год.

По его данным, 15 промышленных предприятий в 2002 году стали убыточными (в 2000 году таковых насчитывалось 4, в 2001 – 11). Запасов готовой продукции на складах барановичских субъектов хозяйствования скопилось на сумму 23 млрд. рублей, что составляет около 50 процентов городского бюджета за прошлый год.

Татьяна ГРИНКЕВИЧ

МАСТЫ

П'ЮЦЬ, СКАНДАЛЯЦЬ, ЗАБІВАЮЦЬ

Згодна з паведамленнямі Мастоўскага РАУС, на працягу мінулага года амаль дзвесце жыхароў горада і раёна былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за самагонаварэнне.

Знішчана болей як 30 самагонных апаратаў, звыш паўтары сотні літраў самагону і паўтары тысячы літраў брагі.

За гэты час за парушэнне антыалкагольнага заканадаўства да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута амаль чатыры тысячы чалавек, з іх 116 падлеткаў, зафіксавана 600 сямейна-бытавых скандалаў на глебе п'янства. За мінулы год ад рук алкаголікаў загінулі 2 чалавека.

На дадзены момант у наркалагічным кабінеце Мастоўскага ТМА стаіць на ўліку 735 чалавек.

Амаль да 80 п'яных скандалістаў быў прыменены адміністрацыйны арышт, амаль сорак чалавек былі накіраваны на выпраўленчыя работы, на 440 выпівох накладзены штраф. 14 хранічных алкаголікаў за сістэматычнае парушэнне грамадскага парадку асуджаны да ізаляцыі ў ЛПП.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЗЭЛЬВА

КОЛЬКАСЦЬ ЗЛАЧЫНСТВАЎ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

Днямі ў Зэльвенскім РАУС адбылася нарада, на якой разглядаліся вынікі работы раённага аддзела унутраных спраў у 2002 годзе.

За мінулы год раённым аддзелам унутраных спраў на тэрыторыі Зэльвенскага раёна зарэгістравана 259 злачынстваў, што сведчыць аб павелічэнні іх колькасці ў параўнанні з 2001 годам. Найбольш распаўсюджаным злачынствам з'яўляецца крадзёж. Так, за вышэйадзначаны перыяд у раёне здзейснена 43 крадзяжы маёмасці з прыватных кватэр і дамоў.

Карыстаючыся службовым становішчам, адказныя асобы здзейснілі крадзёж. За 2002 год 9 жыхароў Зэльвеншчыны былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў. 110 бацькоў прыцягнуты да адміністратыўнай адказнасці за невыкананне бацькоўскіх абавязкаў. 13 жыхароў раёна асуджаны на прымусовае лячэнне ў ЛПП. За мінулы год на тэрыторыі Зэльвенскага раёна адбылося 24 дарожна-транспартных здарэнні. У аварыях загінула 6 чалавек.

Пра гэта карэспандэнту "ГС" паведамілі ў Зэльвенскім РАУС.

Наталля ГЛУШЭНЯ

МАСТЫ

ПАЗБАВІЛІСЯ АКЦЫЙ

Апошняя сесія Мастоўскага райсавета зацвердзіла рашэнне райвыканкама "Аб прыёмцы ў камунальную ўласнасць раёна дзяржаўнай долі акцый ААТ "Мастоўдрэў".

Такое рашэнне прадыктавана хутчэй за ўсё неэфектыўнай працай прадпрыемства, паколькі працэнт выплат па акцыях мізэрны на працягу некалькіх апошніх гадоў.

Антон МАКЕЙ

ДОБРА, АЛЕ МАЛА

З 8 студзеня бягучага года адкрыўся аўтобусны рух па маршруту Гродна–Масты–Навагрудак.

Маршрут пралягае праз населеныя пункты Курылавічы, Мілявічы Мастоўскага раёна, Дзярэчын Зэльвенскага, райцэнтр Дзятлава. За апошнія 10 гадоў у мастаўчан зноў з'явілася магчымасць патрапіць у гэтую частку Гродзенскай вобласці без перасадкі. Праўда, у аўтобусе толькі 9 пасадачных месцаў, але кошт праезду ніжэйшы, чым у звычайным аўтатранспарце.

Аўтобус курсіруе штодзённа, акрамя суботы.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ФЕСТЫВАЛЬ ЦАРКОЎНАЙ ПЕСНІ

У Мастах на праваслаўныя Каляды адбыўся фестываль "Праваслаўныя спяванні Гродзенскай епархіі".

У ім прынялі ўдзел 17 хароў і ансамбляў Мастоўскага і Шчучынскага благачыння, а таксама некалькі свецкіх калектываў.

Журы ўзначальваў клірык Свята-Барысаглебскай царквы г. Гродна, член Саюза кампазітараў, іерэй Андрэй Бандарэнка. Лепшымі прызнаны пяць калектываў: хор Царквы Усіх Тужлівых Радасці, ансамбль гэтай царквы, а таксама ансамблі Дубненскай Свята-Мікалаеўскай Царквы і Свята-Мікалаеўскай Царквы горада Шчучына.

Сярод свецкіх калектываў лепшым прызнаны дзіцячы хор школы мастацтваў. Усе яны будуць прадстаўляць благачынне ў епархіі ў Гродне.


Фестываль прайшоў пры перапоўненай зале раённага дома культуры. Ён распачаўся і закончыўся малітвай.

ЗАТРЫМАНЫ АМАТАРЫ МУЗЫКІ

Супрацоўнікі Мастоўскага ДАІ падчас праверкі аднаго з аўтамабіляў выявілі крадзеныя аўтамагнітолы.

Затрыманы два жыхары горада Ваўкавыска, якія, па папярэдніх дадзеных, кралі гэтыя рэчы з машын мастаўчан на працягу некалькіх гадоў.

Антон МАКЕЙ



Наш Web: http:\\gs.promedia.by

НАВІНЫ

ОТДЫХ ДОРОЖАЕТ

В январе в Беларуси выросли цены на путевки в санатории, профилактории и дома отдыха.

Как сообщил заместитель директора Республиканского центра по оздоровлению и санаторно-курортному лечению Николай Лукашевич, в среднем организованный отдых подорожал на 2-3,5%. Сегодня путевка для работающих обойдется в 350-380 тыс. бел. руб.

Дешевле будет стоить отдых для так называемых "чернобыльцев" – 250-290 тыс. бел. руб.

НОВАЯ ВОЛНА УВОЛЬНЕНИЙ

Руководители предприятий, не предотвратившие возникновение несвоевременной выплаты зарплаты, должны быть уволены без права занимать в будущем руководящие посты.

Такое указание дал вчера премьер-министру Беларуси Геннадию Новицкому президент страны Александр Лукашенко.

ХАРТИЯ–97

ДЛЯ НЕАБЫЯКАВЫХ ЖАНЧЫН

Спосабы павышэння ўдзелу жанчын у прыняцці рашэнняў на мясцовым узроўні будуць абмяркоўваць удзельніцы семінару, які адбудзецца 24–25 студзеня ў Гродне.

Семінар ладзіцца ў межах праекта Праграмы развіцця ААН "Спрыянне пашырэнню грамадскага ўдзелу жанчын у Рэспубліцы Беларусь". Выканнаем праекта займаецца Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт пры ўдзеле Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

Удзельніцы семінару пазнаёмяцца з арганізацыяй мясцовага самакіравання, выбарчым заканадаўствам, тэхналогіямі перадвыбарчай кампаніі.

Перавагай пры адборы ўдзельніц семінару будуць карыстацца жанчыны, якія маюць намер балаціравацца ў мясцовыя саветы альбо працаваць у штабах кандыдатак у дэпутаты.

Наш адрас: 230009, а/с 54, Гродна, – альбо па факсу (0-152) 96-74-78 ці e-mail trecisektar@yahoo.com (каардынатар – Сяргей Кузняцоў).

Вітаўт РУДНІК

ЗЕЛЬВА

С СОВКОМ ПОШЛА НА МУЖА

В деревне Коневцы Зельвенского района полевод колхоза «Прогресс» убила своего мужа металлическим совком.

Все началось с того, что между супружеской парой возникла бытовая ссора, которая затем перешла в драку. Выясняя отношения уже в более грубой форме, женщина схватила совок и несколько раз ударила им мужа по голове. В результате, мужчина скончался.

«МВ»

ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА

МАЛАДЫ, ПРЫГОЖЫ, НЕЖАНАТЫ...

Яго службовы кабінет быў напоўнены пахам дэзадаранту і сонечным святлом. Здаецца, чуваць, як залацістыя праменьчыкі звіняць на дыване, што засціла падлогу, на шафах з кнігамі, на чыстых, акуратных сценах.



Святаслаў Заяц, дырэктар школы

Святаслаў Сяргеевіч Заяц, бадай, ці не самы малады дырэктар школы ў Дзятлаўскім раёне. Малады, але таленавіты і аўтарытэтны, умее ладзіць, як з дзецьмі, так і з дарослымі, уважлівы, культурны, інтэлігентны, добразычлівы. Словам, такі, якім і павінен быць дырэктар школы.

Ён родам з вёскі Дзям'янавічы – краю надзвычай прыгожага і рамантычнага. Людзі там спакойныя, ураўнаважаныя, спагадлівыя. Такім рос і Святаслаў Заяц. Ён вельмі любіў спорт і ў марах бачыў сябе не менш, як футбалістам мінскага "Дынама". Для гэтага добра вучыўся, шмат трэніраваўся, а пасля заканчэння школы паступіў у Гродзенскі тэхнікум фізічнай культуры.

Працаваў настаўнікам базавай школы ў вёсцы Вялікія Шастакі (была некалі такая). "Аж" два месяцы адпрацаваў, а пасля прызвалі ў армію, куды ён пайшоў з вялікім задавальненнем.

— Вы сапраўды лічыце, што армія — гэта школа жыцця? — пытаю ў Станіслава Сяргеевіча.

— Сапраўды. І не толькі я так лічу. Я там атрымаў добрую фізічную і маральную загартоўку. Да службы быў вельмі сарамлівы, чырванеў, як дзяўчына. Там гэта "дзявочая" звычка знікла. Я прайшоў праз так званую вучэбку, а калі яе закончыў, камандаванне пакінула там жа вучыць маладых салдат. Даслужыўся да старшыны. Навучыўся працаваць з людзьмі, стаў упэўненым у сабе.

Пасля службы крыху адпачыў і пайшоў у аддзел адукацыі прасіць работу. Мяне накіравалі настаўнікам фізкультуры ў Рудаяварскую сярэднюю школу.

— Не засумавалі, што так далёка ад райцэнтра, што ў лясную глыбінку?

— Дык я ж і родам з лясных мясцін. Люблю прыроду, усё жывое на зямлі. Тут такія цудоўныя світанні! А як хораша цвітуць вясной сады! У Рудзе-Яварскай мне спадабалася. Падумалася толькі, што тэхнікумаўскай адукацыі малавата, і паступіў на гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Вучыўся завочна.

— Мара пра мінскае "Дынама" жыла і тады?

— Не, школа паланіла мяне, душой цягнуўся да дзяцей, а яны – да мяне. Мы стварылі добрую валейбольную каманду і шмат трэніраваліся, не раз займалі прызавыя месцы па валейболу ў раёне. А каманда дзяўчынак была чэмпіёнам раёна сем гадоў запар. Выступалі таксама і за вобласць.

— Памятаю, вы былі настаўнікам года. Гэта значыць, лепшым настаўнікам у раёне...

— Было такое. Тады я меў усяго 25 гадоў. А ў вобласці з 34 настаўнікаў быў адзінаццатым.

— І дэпутатам абласнога Савета былі?

— Быў. Але самым галоўным для мяне заўсёды заставалася школа. Ужо чатыры гады мінула, як я тут дырэктар. З гонарам часта гавару "мая школа". Гэта не якаясьці там ганарыстасць ці эгаізм. Проста, тут усё маё жыццё: поспехі і няўдачы, радасць і смутак – усё звязана са школай. Тут мой дом, мая сям'я, маё шчасце.

— Святаслаў Сяргеевіч, не палічыце за назойлівасць, але чаму вы да гэтай пары не жанаты?

— Кахаў не тых, на кім можна было жаніцца. (Смяецца: гэта жарт...)

— Дык у вашай жа школе і цяпер ёсць маладыя настаўніцы...

— Настолькі маладыя, што яны на мяне ўжо не глядзяць. Адна за другой пакрысе выходзяць замуж.

— Але ў школе застаюцца. Чым вы можаце растлумачыць той факт, што да вас ахвотна едуць маладыя настаўнікі і не збягаюць, прыжываюцца?

— Усё проста: яны, як і я, вельмі любяць школу, дзяцей, любяць гэтыя цудоўныя мясціны. Галоўнае ж не ў тым, дзе ты жывеш, а як жывеш. Мы шмат займаемся спортам. Кожны вечар адчынены дзверы трэнажорнай залы, дзе займаюцца як дзеці, так і дарослыя. Гуляем таксама ў тэніс, шашкі, шахматы, робім экскурсіі па навакольных мясцінах. У нас цікава.

— Вы жывяце адзін?

— Так. У мяне двухпакаёвая кватэра ў доме для настаўнікаў. Часта наведваю сваю маму, якая жыве ў Дзям'янавічах, дапамагаю ёй усім, чым толькі можна. А наогул, вельмі шмат чытаю, бо мяне цікавіць усё.

— Пра што вы марыце?

— Стварыць школу радасці, каб настаўнікі, усе да аднаго, маглі творча працаваць, а дзеці – вучыцца. У некаторай ступені нам гэта ўжо ўдалося, раз з такой глушэчы (да райцэнтра 25 кіламетраў) не ўцякаюць маладыя педагогі.

— Святаслаў Сяргеевіч, адзінота вас не прыгнятае? Усё ж-такі жыць аднаму няпроста...

— Няпроста, але што зробіш... З гадамі, так бы мовіць, становіцца менш жаданняў і больш меланхоліі.

— Вы верыце ў лёс?

— Не. Лічу, што чалавек у жыцці павінен сам прабіваць сабе дарогу, а не спадзявацца на лёс, бо на яго можна спісаць многія свае недахопы і не змагацца з імі, а пакарыцца. Гэта не ў маіх правілах. Так было заўсёды.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ВОЛКОВЫСК

СОЗДАНА ЕЩЁ ОДНА ПАРТИЯ

Состоялось организационное собрание по созданию на Волковыщине ещё одной политической партии — коммунистической партии Беларуси.

До этого в районе было зарегистрировано три политические партии: либерально-демократическая, аграрная и партия коммунистов Белорусская.

ПОГИБ ХОЗЯИН ДОМА

Ранним утром дежурному пожарной части поступило сообщение о пожаре в деревне Личицы.

Спасатели незамедлительно прибыли на место происшествия, но огонь уже охватил весь дом, и кровля с потолочными перекрытиями рухнула. В результате пожара погиб хозяин дома, 72-летний пенсионер.

